*Аўсянікі.* Ля в. Аўсянікі, у лесе, на беразе воз. Старасельскае, каля дарогі ў в. Бельнякі, курган. Да нядаўняга часу тут быў могільнік, які меў насыпы дыяметрам 10—15 м, вышынёй 1,5—3 м. На могільніку пахаваны крывічы. Датуецца канцом 1-га — пачаткам 2-га тысячагоддзя н. э.

*Бор.* Ля в. Бор за 1 км на ПнУ, на левым беразе безназоўнай рэчкі, курганны могільнік з 5 насыпаў вышынёй 2,5 м, дыяметрам 10 м. Мясцовая назва Шведскія магілы. Раскопкі не праводзіліся.

*Васькаўшчына.* Ля в. Васькаўшчына за 2 км на ПдЗ ад вёскі, на левым беразе р. Ульянка, курганны могільнік з 8 курганоў вышынёй 0,6—3,6 м, дыяметрам 9—11 м. Мясцовая назва Валатоўкі. Насыпы пясчаныя, некаторыя абкладзены валунамі. Раскопкі не праводзіліся.

*Гара.* Ля в. Гара за 1 км на Пд, на могілках, курганны могільнік з 6 насыпаў вышынёй 0,6—1,2 м, дыяметрам 8—12 м. Мясцовая назва Напалеонаўскія магілы. Курганы моцна аплылі, асобныя пашкоджаны ямамі. Вядомы могільнік з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

*Гогалеўка.* Ля в. Гогалеўка маюцца 2 курганныя могільнікі.

Могільнік 1 за 3,5 км на У ад вёскі, абапал дарогі Кашчына — Фёдараўка, у лесе. У ім 11 курганоў дыяметрам 6—12 м, вышынёй 0,9—2,3 м. Насыпы раздзірванелыя і зараслі лесам. Раскопкі не праводзіліся.

Могільнік 2 за 3 км на ПнУ ад вёскі, за 0,6 км на Пн ад могільніка 1, справа ад дарогі Кашчына — Фёдараўка. У ім 3 насыпы вышынёй 0,3—0,6 м, дыяметрам 8 м, моцна аплылі. Раскопкі не праводзіліся.

*Грынькі.* Ля в. Грынькі за 2,5 км на ПнУ, злева ад дарогі на в. Запруддзе, у лесе, курганны могільнік з 7 насыпаў вышынёй 1,3 м, дыяметрам 10—13 м. Мясцовая назва Напалеонаўскія магілы. Раскопкі не праводзіліся.

*Закур'е.* Ля в. Закур'е за 1,5 км на ПдЗ ад вёскі, побач з шашою Чашнікі — Новалукомль, курганны могільнік. Раней тут налічвалася каля 100 курганоў. У 1888 г. Е. Р. Раманаў даследаваў 3 курганы: у 1-м знойдзены рэшткі крэмацыі, у 2-м — трупапалажэнне. Рэчавы інвентар складалі нож, сярэбраны пярсцёнак, 5 пацерак і 2 завушніцы (напэўна, скроневыя кольцы).



Курганны могільнік ля вёскі Закур'е